

THE
ULTI
ES™
ISSUE
8
эксперты
MILLAR
HITCH
CURRIE
MARVEL
.BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
The Ultimate
№8 (2002)
пераклад
і афармленне:
Козыраў Сяргей
(c) 2010 Marvel Characters, Inc. All rights reserved.
WWW.MARVEL.COM
Reading Comics online: VIEWCOMIC.COM





# PREVIOUSLY IN THE ULTIMATES:

З-за рэўнасці доктар Брус Банэр ператварыў сябе ў звар'яцелага монстра, вядомага як Халк, і атакаваў Манхэтан, забіваючы сотні нявінных жыхароў горада. Сусветная прэм'ера ініцыятывы звышчалавечай абароны, Алцімэйтс, была ў стане спыніць яго, але змагла толькі коштам значных страт. Банэр, удзельнік каманды, памешчаны ў турму.

Сварка паміж другімі ўдзельнікамі каманды Волатам і Асой заканчвацца жудаснымі наступствамі: Аса з крытычным стане, а Волат ва ўцёках. Капітан Амерыка вырашае самастойна знайсці Хэнка і даць пад суд.

Цяпер пустэчу ў камандзе Алцімэйтс трэба запоўніць, што і робіць дырэктар Абароны Нік Ф'юры...



Stan Lee presents:

# THE ULTIMATES

Mark Millar story

pencils Bryan Hitch Paul Neary inks

Paul Mounts colors | Chris Eliopoulos letters | C.B. Cebulski associate editor | Brian Smith associate editor | Ralph Macchio editor

editor in chief Joe Quesada Bill Jemas president & inspiration


Наташа, табе які офісны будынак больш падабаецца: той, што **злева**, ці той, што **справа**?
Той, што злева, мой дарагі таварыш. Згадзіся, што гэтае адценне граніта так і **прыцягвае позірк**.
RICK
RJ
Jones
cafeteria
SANDWICH



Падмаца-ванне?
Паведамьце, калі будзеце **гатовыя**, Чорная ўдава.
Ахова?
Перакрыем усе шляхі, як толькі скажаце, Сакалінае вока.
**Пачынаем**, спадары.



Чым магу дапамагчы?
У мяне на чатыры гадзіны дня запланавана сустрэча з **містарам Джонсам з бухгалтэрыі**. Перадайце, што **Клінт Бартан** чакае яго.
Прабачце, містар Бартан. Намэўна, тут нейкая памылка. У бухгалтэрыі на сёння не запланавана **ніякіх** сустрэч.
Сапраўды? Вы нават не паглядзелі ў кнігу запісаў.
Мне ня трэба нікуды падглядаць. **Вось тут** захоўваецца інфармацыя аб усіх сустрэчах.
Сур'ёзна?
Так.



Ужо **не**, лысы!


У фае ўсё чыста. Атрад «Альфа»... заняць з **другога** па **пятнаццаты** паверхі. Атрад «Бета»... вы, як і планавалася, возьмеце на сябе з **шаснаццатага** па **трыццаць другі** паверхі.
Я возьму на сябе **ліфт**.


Атрады «Гама», «Дэльта», «Іпсілон» і «Зэта»... можаць пачынаць. Паўтараю, можаце пачынаць!
UN
AE
Чорная ўдава, гаворыць Сакалінае вока! Чорная ўдава, гаворыць Сакалінае вока! Ты ўжо заняла **пазіцыю**? Як чуць?
33


Пазіцыя **занята**, Сакалінае вока!
Пачынаю **знішчэнне шкоднікаў з трыццаць трэццяга** па **сорак восьмы** паверхі, як і планіравалася. Толькі **не падабаецца** мне гэта.
Чаму? Усё занадта **лёгка** атрымліваецца?
Не **ўскладняй жыццё** яшчэ больш, сяброўка. Чым прасцей, тым лепш! Ніколі ня ведаеш, **які сурпрыз** цябе чакае наперадзе.


Так, але я чакала большага **супрацiўлення**. Выведка «Абароны» паведамiла, што тут - уся-го толькi працоўныя пшчолкi... Маленькiя выканаўцы, задача якiх - вядзенне архiваў, але...
Наташа, дзеля бога!
Што?
Я, канешне, разумею, што ты ў нас нерэальна крутая i ўсё такое, але я не магу выконваць працу i размаўляць **адначасова**!
Не пашкодзьце **кампутары**, рабяты!
Рабiце з гэтым офiсным планктонам, што хочаце, але ў гэтых кампутарах можа знаходзiцца **важная iнфармацыя**.
Пачакайце, сэр! Адна з гэтых iстот сцiскае ў руцэ нешта **шкоднiкаў**...
На **што** гэта падобна, салдат?
Я не ўпэўнены, але падобна на...


20


HAWKEYE!
О божа!
Зямля - Сакалінаму воку. Зямля - Сакалінаму воку! Вы чуеце мяне?.. Паўтараю, вы чуеце мяне?



Выдатна чую вас, дыспетчар! У мяне атрымалася выцягнуць Маквілана. Але астатнім шасцістам **не пашанцавала**, сэр.
Сакалінае вока, гаворыць Паветраны атрад. Вы не адзіныя, хто выжыў пасля выбуху. **Тры ці чатыры «спячых» агентаў** накіроўваюцца да вас.
Можаце іх знішчыць?
Гэта **немагчыма**. Паведамьце яму, што я не магу ўзяць цэль.
Удава!
Я **чую** цябе, Сакалінае вока. На якім ты паверсе?
На **трыццаць дзевятым**.


Не, **пачакай**! На **трыццаць восьмым**!
Паветраны атрад, на якой вы зараз **вышыні**?
Ээ... **шэсцьсот дваццаць восем футаў**, Чорная ўдава.
Добра. У мяне **скончыліся патроны**. Я хачу, каб ваш снайпер кінуў сюды сваю **вінтоўку**.
Што? Ты звар'яцела?
Лепш затыкніся і **рабі** тое, што табе **кажуць**, нікчэмны малец!


Гэта табе за ўсё...
Кідай!


Не можа быць.
Не!


Удава, адкажы! Што там у вас адбываецца, чорт пабяры?
**Не бурчы!** Ты ж не стары сабака, Сакалінае вока.
У нас тут **спакойна як у магіле**, дарагі.


ТРЫКСЕЛІЁН:
ШТАБ-КВАТЭРА АЛЦІМЭЙТС У ПЯЦІ МІЛЯХ АД УЗБЯРЭЖЖА НЮ-ЁРКА
Хачу прадставіць вам лепшых байцоў сакрэтнага спецатрада «Абароны». **Клінт** і **Наташа**, гэта **Тоні Старк** і **Тор**.
Вы, магчыма, чулі, што ў гэтым месяцы Клінт і Наташа **афіцыйна** ўступяць у нашу арганізацыю, як толькі мы падрыхтуем для іх **профілі**.
**Ртуць** і **Пунсовая ведзьма** па відавочных прычынах пакуль застануцца на **сакрэтнай службе**.



Нават ня ведаю, што мяне здзіўляе больш, генерал Ф'юры... Тое, што Братэрства мутантаў працуе на «Абарону» ці тое, што вы запрасілі на працу дзяцей Магнета.
Ужо не першы раз спецслужбы ідуць на ўгоду з тэрарыстамі, здаравяка.
Ды і Братэрства мутантаў, што б яны там ні казалі ў смі, не пагрэбаюць працаваць на людзей, калі ім прапануюць добрую цэну. Я мею рацыю, Ванда?
Мяркую, генерал спрабуе сказаць, што мы з братам згадзіліся прымаць удзел у некаторых аперацыях «Абароны» ў абмен на вызваленне палітычных зняволенных.
А што ты рабіла сёння днём, мілачка? Памятаю толькі, як раніцай вы з П'етра сядзелі ў кафэ і хіхікалі, быццам школьніцы.
Калі ты праглядзіш у запаволеным рэжыме запісы з камер відэаназірання бізнэс-цэнтра, тады ты зразумееш, што я тройчы выратоўваў табе жыццё, няўдзячная.
Хлусіш.
А ты правер запісы.
Паслухайце, а што з Капітанам Амерыка? Я не хачу нікога пакрыўдзіць, але я лічыў, што нас прыкрые дасведчаны баец.
Я ведаю аб гэтым не больш, чым ты, сынок. Мы зафіксавалі яго сігнал, а таксама Хэнка Піма, але, нажаль, спадарожнікавая сістэма пакуль не вызначыла іх дакладнае месцазнаходжанне.
Нік, стары, кожныя дзесяць хвілін, што я тут прасіжваю порткі, «Старк» губляе па мільёну даляраў. Мабыць, пяройдзем непасрэдна да справы?



Добра. Але тым, хто **толькі зараз** атрымаў доступ да звышсакрэтнай інфармацыі, лепш **прысесці**. Тое, што я зараз скажу, супярэчыць звесткам, якія мы перадавалі прэсе.
Ой, ну хопіць ужо паводзіць сябе як дзіцё...
На дадзены момант на Зямлі знаходзяцца прадстаўнікі **адзінаццаці** іншапланетных рас. І гэта толькі тыя, аб якіх нам **вядома**.
Адні з іх, **чытаўры**, прыляцелі сюды ў 1777 годзе і былі вінаватыя ў некалькіх генацыдах. Самы масавы з іх адбыўся пад час Другой сусветнай вайны.
Велізарныя, падобныя на рэптылій чытаўры, здольны прымаць **чалавечы выгляд**...
...У 20-я гады мінулага стагоддзя яны змаглі пракрасціся на палітычную арэну Германіі і спрыялі ўзвышэнню Нацыянал-сацыялістычнай партыі і Адольфа Гітлера.
Дзякуючы нацыстам чытаўры амаль не захапілі ўладу над усім светам, але ў 1945-м годзе яны былі выгнаны з Еўропы і Афрыкі...
А потым былі знішчаны іх трэніровачныя базы ў Японіі.



Пасля вайны мы лічылі, што з імі **скончана**. Але два гады назад у рацэ недалёка ад Калькуты знайшлі свежы труп чытаўры.
У мінулым годзе іх **чатыры разы** бачылі ва **Ўсходняй Еўропе** і **тры** разы ў **Сінгапуры**. Але **Нью-Ёрк** засмуціў нас больш за ўсё.
**Пяцьсот дваццаць восем спячых агентаў**. Яны ўдзельнічалі ў самай рознай дзейнасці: ад атручання вады наркотыкам, які душыць свядомасць, да ўкаранення ў сродкі масамай інфармацыі.
І гэта - толькі **паверхня айсберга**. Па нашых дадзеных, чытаўры рыхтуюць тэракт **планетарнага** маштаба.
Які дакладна?
Мы зараз спрабуем гэта высвятліць. Тое, што ў нас не атрымаецца знасці ў іх кампутарах, наш **атрад тэлепатаў** давядзецца праз пранікненне ў іх свядомасць.
Нам толькі вядома, што ўсё звязана ў асноўным са зброяй **масавага знішчэння** і што іх штаб-кватэра знаходзіцца дзесьці ў раёне **Мікранэзіі**.
Божа мой!
Я адзіны, каго гэта **патрэсла да глыбіні** душы? Ці вы ўсе проста робіце выгляд такіх **стрыманых** і **спакойных** людзей?
Нарэшце вы зразумелі, што патрапілі ў свет крутых рабят, таварышч Старк!


Наташа, ты калі-небудзь бачыла гэтых істот?
Не. Але кажуць, што **Капітан Амерыка забіў аднаго з іх у Польшчы ў часы вайны**. Калі я працавала ў КГБ, чула, што тры чытаўры захоўваліся ў нашым сакрэтным музеі ў заспіртаваным выглядзе.
Дык што ж, рабяты, хочаце ўбачыць уласнымі вачамі?
Праходзьце, сэр. Яны губляюць здольнасць да відазмянення праз **дзевяноста восем хвілін**. Рыхтуйцеся, рабяты... **Відовішча не з прыемных**!
Нічога сабе!
Цікава будзе паглядзець на рэакцыю Капітана Амерыка, калі ён даведаецца, што **справа**, якую ён лічыў **завершанай**, **зноў распачата**.




Генерал Ф'юры, гэта - спадарожнікавы аддзел. Мы толькі што высачылі Капітана Амерыка ў **цэнтры Чыкага**. Ён сцвярджае, што дзейнічае па **вашаму загаду**.
Што? Паўтарыце.
Ён сказаў, што вы даручылі яму кіраваць затрыманнем доктара Піма, якога абвінавачваюць у гвалце над яго жаной, Асы. Сэр, вы **пацвярджаеце** гэтую інфармацыю?
О божа...
THE RED LION
THE ONLY ENGLISH PUB FOR
FOOD • DRINK
PROPERTY SALES & MANAGEMENT
871-1871



Камандзір эскадрылы, гэта генерал Нікалас Ф'юры. Я хачу, каб вы перадалі Капітану Амерыка - ні ў якіх, паўтараю, ні ў якіх абставінах ён не павінен **параніць** доктара Піма.
Нам пагражае **іншапланетнае ўварванне** і спатрэбіцца дапамога ўсіх звышлюдзей. Вам зразумела?
Паўтарыць, шаноўны?
Чаму б і не? Горш усё роўна ўжо ня будзе.
Прабачце, генерал, але мы **дысанціравалі** Капітана Амерыка **чатыры хвіліны назад**.


Трэба
пагаварыць,
доктар Пім.
To be continued...







# ЗОРНЫЯ ВОЙНЫ. ДАРТ ВЭЙДЭР

(MARVEL, 2015)

**ужо даступны на www.patreon.com/comicsby**


**Gillen, Larroca, Delgado.** Дзеянне адбываецца пасля падзей «Зорных войн: Эпізод IV: Новая надзея» і першых трох выпускаў комікса «Зорныя войны». Дарт Вэйдэр павінен пакутаваць ад наступстваў яго няздольнасці спыніць Альянс паўстанцаў падчас бітвы пры Явіне, і адпраўляецца на місію, каб весці перамовы з Джаба Хатам . Тым часам Вэйдэр наймае двух паляўнічых за галовамі, каб схапіць Люка Скайуокера і таямнічага агента Імператара.














# NEW 52
# ЦУДА-ЖАНЧЫНА.
(DC, 2011)

**ужо даступны на www.patreon.com/comicsby**

**Azzarello, Chiang.**
Богі ходзяць сярод нас. Толькі адна жанчына адважылася б абараняць чалавецтва ад гневу такіх дзіўных і магутных сілаў. Але яна адна з нас ці адна з іх? Новая эра пачынаецца для амазонскай прынцэсы Цуда-Жанчыны пад аўтарствам Браяна Азарэла і Кліфа Чанга.











# ВЯДЗЬМАР. ДОМ СА ШКЛА

(Dark Horse, 2014)




**ужо даступны на www.patreon.com/comicsby**

**Tobin, Querio.**
Вандруючы каля Чорнага леса Геральт сустракае самотнага паляўнічага. Аказалася, што той калісьці аўдавеў, але яго жана засталася ў свеце жывых. Уцякаючы ад лесавіка вядзьмар са сваім новым сябрам трапляюць на Дом са шкла...










# ТОМ 1.
# ЧАРАПАШКІ-НІНЗЯ
## (IDW PUBLISHING, 2011)





**уся калекцыя на www.patreon.com/comicsby**

**Teenage mutant ninja turtles. TPB 1 (#1-4). Change is Constant**
**(c) Kevin Eastman, Tom Waltz, Dan Duncan**
**(c) IDW Publishing, 2012**
**Чарапашкі-нінзя. Том 1 (№1-4). Змены гэта сталасць**
**Пераклад на беларускую мову - Сяргей Козыраў, 2012**
**ComicsBY, Гомель, 2022**
**Другая рэдакцыя**

Чарапашкі-нінзя вяртаюцца ў коміксы ў сваёй першай прыгодзе IDW! Для Чарапашак гэта іншы свет... Група падзелена: Рафаэль блукае па вуліцах Ню-Ёрка ў пошуках ежы і сховішча, а яго браты і майстар Сплінтар займаюцца пошукамі згубленага брата, але пакуль усё, што яны могуць знайсці, гэта непрыемнасці ў выглядзе валачашчага ката-мутанта Старога Нячысціка і яго банды злачынцаў!
Далучайцеся да Тома Вальца, Дэна Данкана і аднаго са стваральнікаў TMNT Кевіна Істмана, каб пачаць дзікае падарожжа!




**Kevin Eastman**



**Tom Waltz**






# ТОМ 1.
# ХАДЗЯЧЫЯ МЕРЦВЯКІ
## (IMAGE COMICS, 2003)

**уся калекцыя на www.patreon.com/comicsby**

**The Walking dead. TPB 1 (#1-6). Days Gone Bye**

**Хадзячыя мерцвякі. Том 1 (№1-6). Дні мінулыя**
**Пераклад на беларускую мову - Алена Васількова**
**ComicsBY, Гомель, 2012**
**Другая рэдакцыя**

Рык Грэймс не быў гатовы да гэтага. Пару месяцаў назад ён быў паліцэйскім з маленькага гарадка, які ні разу не страляў і бачыў мёртвае цела толькі раз у сваім жыцці.
Разлучаны са сваёй сям'ёй, ён цяпер павінен разабрацца са смерцю і замяшаннем, каб паспрабаваць знайсці сваіх жану і сына.



**Robert Kirkman**



**Tony Moore**

# СТАНЬ ЧАСТКАЙ НАШАЙ СУПОЛЬНАСЦІ НА PATREON

**www.patreon.com/comicsby**

Твой удзел дапаможа нам праводзіць больш часу за перакладамі коміксаў, каб у цябе было яшчэ больш літаратуры на беларускай мове.

## Выбяры адзін з варыянтаў на patreon:

### Чытач

**1 $**
ЗА МЕСЯЦ

**ДАЛУЧЫЦЦА**

Калі ты сапраўдны **ЧЫТАЧ**. Даступны нашы рэлізы на месяц раней, чым у сацыяльных сетках і артыкулы пра коміксы і іх герояў.

- На 1 месяц раней, чым усе
- Артыкулы

### Афіцыйны патрон

**3 $**
ЗА МЕСЯЦ

**ДАЛУЧЫЦЦА**

Цяпер **АФІЦЫЙНЫ ПАТРОН** атрымлівае спасылку на **рэліз новых серый на 1 год раней**, чым падпішчыкі сацыяльных сетак. Сярод такіх новых серый мы плануем коміксы «**Цуда-жанчына**», «**Дарт Вэйдар**», «**Вядзьмар**», «**Чорны молат**», «**Дэпартамент праўды**» і інш. Спачатку - па 2 выпускі ў месяц, а далей - у залежнасці ад колькасці афіцыйных патронаў. Таксама афіцыйным патронам даступны «Дзённік перакладчыка» і «Планы».

- На 1 год раней, чым усе
- Дотык да новых серый коміксаў
- На 1 месяц раней, чым усе
- «Дзённік перакладчыка», «Планы»
- Артыкулы

### Патрон з падпіскай прэміўм

**5 $**
ЗА МЕСЯЦ

**ДАЛУЧЫЦЦА**

**ПАТРОН З ПАДПІСКАЙ ПРЭМІУМ** атрымлівае ўсё тое, што і Афіцыйныя патроны, але... Для патронаў з падпіскай прэміум мы плануем публікацыю эксклюзіўных матэрыялаў.

- Эксклюзіўныя матэрыялы
- На 1 год раней, чым усе
- Дотык да новых серый коміксаў
- На 1 месяц раней, чым усе
- «Дзённік перакладчыка», «Планы»
- Артыкулы

## Нашы мэты:

**100 патронаў** -
мы наймем перакладчыкаў, каб было яшчэ больш перакладаў на беларускую мову.

**500 патронаў** -
мы створым выдавецтва, мэтай якога будзе - электронная публікацыя арыгінальных коміксаў і кніжак на беларускай мове.

**1000 патронаў** -
наша выдавецтва пачне друкаваць папяровыя кніжкі і коміксы з творамі на беларускай мове, якія можна будзе набыць у беларускіх крамах.